Міхась ЦУБА

**Беларусі**

Напісана ў кнігах, нарэдкасць
Пяшчотай напоўненых слоў
Зямлі, што ўзнікла, як ветразь,
Пад крыламі белых буслоў.

Паклонімся нізка тым месцам,
Знаёмым з маленства гадоў.
Старонцы, што мілая сэрцу,
У квецені траўня садоў.

Надыхаемся паветрам
Лясоў і палёў залатых
І ў лепшае заўтра паверым,
Як у лекі крынічнай вады.

Наведаем старыя замкі,
Засведчыць у памяці каб
Гісторыю: вечар, і ранкі,
І нашых славутых асоб.

Напоўнім паэзіяй душы
Ад роднай зямліцы да зор,
Ад багны палескай і сушы
Да самых Браслаўскіх азёр.

Прысвечана ў вершах, нарэдкасць
Пяшчотай напоўненых слоў
Зямлі, што ўзнікла, як ветразь,
Пад крыламі белых буслоў.